Шыфр:________________________

Колькасць балаў:________________

Месца:________________________

Зацвярджаю

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта
намеснік Міністра адукацыі

________________Р.С. Сідарэнка

«06» ______03______2015 года

# ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП XXXI РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Мінск, 2015 г.*

**10 клас**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Варыянт I**

**Заданне 1.** «Пазнайце» запазычаныя словы па лексічных значэннях і даведках аб паходжанні. Упішыце словы ў табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*
(1 бал – за кожнае правільна запісанае слова;
0,5 бала – калі ў слове дапушчана арфаграфічная памылка)

| **Значэнне слова** | **Даведка аб паходжанні** | **Слова-адказ** |
|---|---|---|
| Змешвальнік для прадуктаў з электрапрыводам у ніжняй частцы корпуса. | англ. *blender*, ад *blend* – змешваць | |
| Выдадзеная вялікім тыражом кніга, якая карыстаецца папулярнасцю ў чытачоў. | англ. *bestseller* | |
| Шматпакаёвая кватэра на верхніх паверхах элітнага дома з вышынёй столі не менш за 4 метры (агульнай плошчай 500 і больш метраў). | англ. *penthouse* | |
| Аб'яднанне прыхільнікаў пэўнага музычнага выканаўцы, спартсмена і пад. | англ. *fan club* | |

| | | |
|---|---|---|
| 1. Месцы вышэйшага разраду, павышанай камфортнасці ў самалёце, цягніку і г.д.<br>2. Разрад у класіфікацыі некаторых тэхнічных устройстваў (мабільных тэлефонаў, аўтамабіляў і г.д.).<br>3. Слой грамадства, які займаецца прадпрымальніцкай дзейнасцю. | англ. *business class* | |

**Заданне 2.** У кожным сказе выберыце з дужак слова, якое падыходзіць па сэнсе, падкрэсліце яго.

*Максімальная колькасць балаў – 5*
(1 бал – за кожнае правільна падкрэсленае слова)

1. Колькасць паверхаў у дамах розная, і ў кожнага будынка свой **(цікавы / цікаўны)** архітэктурны воблік (*У. Караткевіч*).
2. Беларусу і ў Парыжы сняцца **(белізна / бялізна)** бяроз і сосен медзь (*П. Панчанка*).
3. Такі лёгкі і **(чуйны / чутны)** быў яго сон (*М. Стральцоў*).
4. Мінуўшчыне няма **(звароту / зваротка)** (*А. Грачанікаў*).
5. Свабоду нашу **(абмяжоўвала / адмяжоўвала)** адно: няведанне дня і часу адлёту (*І. Шамякін*).

**Заданне 3.** Многія фразеалагізмы ўзніклі на вобразнай аснове прыказак. Напрыклад, у выніку скарачэння прыказкі «*Пужаная варона куста баіцца*» ўтварыўся фразеалагізм *пужаная варона*, што мае значэнне ‘залішне асцярожны чалавек, які з-за перажытых выпрабаванняў баіцца нават таго, што не пагражае яму небяспекай’.

Вызначце, якія фразеалагізмы ўтварыліся на аснове наступных прыказак:

- *Не капай другому яму, сам уваlішся.*
- *Прыйдзе каза да воза, ды не будзе сена.*
- *Без працы жыць – толькі неба капціць.*

Упішыце фразеалагізмы ў табліцу ў адпаведнасці з іх значэннямі.

*Максімальная колькасць балаў – 6*
(2 балы – за кожны правільна вызначаны фразеалагізм).

| Значэнне фразеалагізма | Фразеалагізм |
|---|---|
| ‘жыць без пэўнай мэты, без справы, без карысці для іншых’ | |
| выказванне пагрозы, папярэджання ці прароцтва, што хтосьці некалі адумаецца, пакаецца, звернецца з просьбай | |
| ‘рабіць зло, шкодзіць, рыхтаваць вялікую непрыемнасць каму-небудзь’ | |

**Заданне 4.** Вызначце, як утварыліся аўтарскія наватворы.

*Максімальная колькасць балаў – 4*
(0.5 бала за кожную правільна вызначаную ўтваральную аснову,
0.5 бала за кожны правільна вызначаны спосаб утварэння).

1. Калі здаволіцца *лістабой* – стаяць счарнелыя дрэвы самі сабой (Р. Барадулін).
2. Ты красуй у яркай квецені, *шумнаспеўны* мой родны край! (В. Максімовіч).
3. Лістотна *крылаціцца* дрэва жыцця (Р. Барадулін).
4. На *выгарбку*, вятрам усім адкрытым, стаіць сухая, чорная сасна... (Н. Мацяш)

| Аўтарскі наватвор | Утваральная аснова | Спосаб словаўтварэння |
|---|---|---|
| **Узор:** *скурганіць* | *курган* (□) | *прыставачна-суфіксальны:* с-курган + і(ць) |
| *лістабой* | | |
| *шумнаспеўны* | | |
| *крылаціцца* | | |
| *выгарбак* | | |

**Заданне 5.** Вызначце, якой часцінай мовы і якім членам сказа з'яўляюцца выдзеленыя словы.

*Максімальная колькасць балаў – 5*
(0,5 бала за кожны правільны адказ).

1. Плачу даніну дзіўнай здрадзе, што між пялёсткамі лілеі, прыдатная чужой уладзе, быць *пэўнай* (________________________) пэўны час умее (М. Стральцоў).
2. На санным следзе загалосіць полаз. І жнеек на жніво запросіць Колас. І крывічам пра іхні род усім напомніць Богам *дадзены* (________________________) Максім (Р. Барадулін).
3. – Юшка, брат, будзе *першы* (________________________) гатунак. Нават Трыфанавіч (ён сказаў іначай) будзе задаволены (У. Караткевіч).
4. ...Ды зноў ніводзін інстытут Панаса не прыняў. І, што вы думаеце, хлопец здаўся? Ды не! Ён *цэлы* (________________________) год яшчэ чакаў, а потым зноў прыёму дабіваўся (У. Корбан).
5. Кожны будаўнік — у *пэўнай* (________________________) ступені паэт і летуценнік, з вялікаю вераю ў свае сілы і магчымасці (С. Грахоўскі).

**Заданне 6.** Прачытайце. Ад дзеясловаў, што ў дужках, утварыце формы загаднага ладу 2-ой асобы адзіночнага ліку.

*Максімальная колькасць балаў – 5*
(1 бал за кожнае правільна напісанае слова).

1. Працы і світкі не (саромецца) ________________.
2. (Пільнаваць) ________________ тое, з чаго хлеб ясі.
3. (Падыходзіць) ________________, мая дзежачка! Госць на парозе, гаспадар у дарозе, а гаспадыня есці хоча.
4. (Паслаць) ________________, бог, гасцей часцей.
5. (Паджынацца) ________________, нябожа, – заставацца нягожа.

**Заданне 7.** Ці ўважліва Вы чытаеце падручнік?

Дапоўніце схему – (?)___________________ –, каб атрымалася разгорнутая ілюстрацыя да класіфікацыі тыпаў маўлення і характару будовы тэксту.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

ТЫПЫ МАЎЛЕННЯ

| (?) | Апісанне | Разважанне |
|---|---|---|
| | БУДОВА ТЭКСТУ | |
| 1. Завязка.<br>2. (?)_______________<br>3. Развязка. | 1. (?)_______________<br>2. Пералік розных прымет прадмета.<br>3. (?)_______________ | 1. Асноўная думка (тэзіс).<br>2. Доказ гэтай думкі.<br>3. (?)_______________ |
| | На якое пытанне даецца адказ у тэксце? | |
| Што адбываецца з прадметам, чалавекам і г.д.? | Які прадмет, чалавек і г.д.? | Чаму прадмет, чалавек і г.д. такі?<br>Чаму ён робіць так, а не інакш? |

**Заданне 8.** Вызначце вершаваны памер, тып рыфмоўкі і сродак мастацкай выразнасці ў вылучаным курсівам фрагменце. Адказы запішыце ў табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| Вершаваныя радкі | Вершаваны памер | Тып рыфмоўкі | Сродак мастацкай выразнасці |
|---|---|---|---|
| Хай дабрынёю поўніцца душа.<br>Хай дабрыня і ў сэрцы запануе.<br>*Нібыта ўвосень яблыкі з каша,*<br>спагаду ўсім пакутным прапаную.<br>*Артур Вольскі* | | | |
| Замаркотнелі далі,<br>Абляцелі крушыны,<br>Толькі *зерні ўставалі*<br>Там, дзе сейбіт іх кінуў.<br>*Пятрусь Броўка* | | | |
| *Словамі сціплымі*, словамі кволымі<br>я і ўшаную жыццёвае полымя.<br>Думкі лятуць, як дэпешы без адраса,<br>многа ў іх смутку, а больш яшчэ радасці… (*Уладзімір Дубоўка*) | | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Няма на імшарах палескіх<br>скалістых *аснежаных стром*…<br>За вёскай – лугі, пералескі,<br>Бяскрайняе поле кругом.<br>*Мікола Аўрамчык* | | | |

**Заданне 9.** Пазнайце пісьменніка па пэўных фактах, з'явах, мастацкіх вобразах, назвах мастацкіх твораў. Правільны адказ запішыце ў табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

| Факты, з'явы, мастацкія вобразы, назвы мастацкіх твораў | Пісьменнік |
|---|---|
| Віцебшчына, драматургія, Мульцік, "Кім", "Парог" | |
| Стаўбцоўшчына, Нясвіжская настаўніцкая семінарыя, "Родныя з'явы", "Водгулле", цыкл алегарычных апавяданняў | |
| Мінск, польскамоўная і беларускамоўная паэзія, "Роднай старонцы", "Паляўнічыя акварэлькі з Палесся" | |
| Ушацкі раён Віцебскай вобласці, мастацкае вучылішча, "Альпійская балада", Свіст, "Сцюжа" | |
| Магілёўшчына, сентыменталізм, рамантызм і рэалізм, паэзія і драматургія, ""Купала", "Шчароўскія дажынкі" | |
| Міншчына, Інстытут мовазнаўства Акадэміі навук БССР, Зёлкін, байка, "Мілы чалавек", "Брама неўміручасці" | |
| Магілёўшчына, Горацкае каморніцка-агранамічнае вучылішча, "Досвіткі", Архіп Лінкевіч | |
| Віцебшчына, часопіс "Полымя", "Голас сэрца", чабор | |

**Заданне 10.** Прачытайце вершаваны твор Эдуарда Валасевіча "Кот і вожык" і запоўніце табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

– Здарова! Колькі, браце, год?!
Ну, як жывём ды можам?
Апавядай мне, Кот, –
Сказаў пры стрэчы Вожык.

– А што апавядаць? Жыву, як бог!
Ў такое месца цёпленькае трапіў –
Ем і кілбасы, і смятану, і тварог
І сплю па-царску, на канапе...
*– Знішчаеш пацукоў? Ці ловіш ты мышэй?*
*– Ды што ты!*
*Бяры, браток, вышэй –*
*Мурлыкаю на сон гаспадару*
*Ды боты*
*Спінкаю пушыстай тру –*
*Вось тут і ўся работа...*
Калі б не быў ты гэтакі калючы
І лашчыцца б умеў,
Дык жыў бы прыпяваючы і клопату не меў.
– Э, не! – наш Вожык адказаў рашуча,–
Хоць залатыя горы абяцай –
Ля ног не стану ацірацца.
Высока годнасць чалавечую трымай!
Не смей, як кот халуйскі, прыніжацца...
Свой дабрабыт, аўтарытэт стварай
Не ўгодніцтвам, а працай!

| | |
|---|---|
| 1. Да якога літаратурнага роду ці міжродавага ўтварэння адносіцца твор? | |
| 2. Жанр твора | |
| 3. Якія алегарычныя вобразы выкарыстаны ў творы? | |
| 4. Які сродак стварэння сатырычнага эфекту выкарыстаў паэт у вылучаным курсівам фрагменце? | |
| 5. Адным сказам абгрунтуйце, чаму гэты твор з'яўляецца сатырычным? | |